# КАМЕНКО ИВАН МАРТЫНОВИЧ



Расказаць пра свайго дзядулю – гэта той маленькі ўнёсак, які я магу зрабіць у гісторыю. Я была зусім малая, калі ён памёр, амаль што і не памятаю яго знешнасці, але ў маёй сям'і заўсёды гучала, што мой дзядуля – герой, што ён прайшоў ваенныя гады і вярнуўся дамоў.

Каменка Іван Марцінавіч – просты селянін з вёскі Галынка Баранавіцкага раёну. Нарадзіўся ён у 1920 годзе. Падчас вайны спачатку быў на акупаванай тэрыторыі, а ў 1942 годзе быў вывезены на прымусовую працу ў Германію з іншым і аднавяскоўцамі. Па праўдзе кажучы, бабуля расказвала, што яны спрабавалі збегчы, але ні адна са спробаў не была ўдалай. Таму па прыбыцці ў Германію ён з сябрам былі пад арыштам. Праз некаторы час яны знайшлі магчымасць збегчы: іх выкупілі за залаты пярсцёнак. Не ведаючы дарогі, не разумеючы, дзе ты знаходзішся, дзед дабіраўся дамоў каля паўгода: працаваў на фермах, шукаючы прытулак, а па начах ішоў далей. На тэрыторыі Польшчы яго працу ацанілі, бо нашыя людзі сапраўды добрасумленныя і працавітыя. Яму нават прапанавалі застацца і ажаніцца з дочкай аднаго з польскіх гаспадароў, але Іван Марцінавіч адмовіўся: дома чакае сям'я. Па дарозе яго абакралі. Босы, сяк-так ён перабраўся праз Нёман. "Дом ужо блізка", – гэта думка грэла сэрца...

Пасля з'яўлення ў роднай хаце дзядуля быў мабілізаваны ў рады Чырвонай Арміі ў абарончыя войскі Мінску.

Канешне, усе цяжкасці, праз якія прайшоў дзядуля, не маглі не пакінуць свой адбітак: былі цяжкасці са здароўем, але ж памёр ён на сваіх нагах і змог выгадаваць чацвёра дзетак. 22 верасня 2004 года жыццё майго дзядулі скончылася. Пахаванне праходзіла з салдацкімі пашанамі: саладаты давалі салют.

Вось такое невялічкае сведчанне аб адным з мільёнаў герояў нашай краіны, якія праклалі шлях да чыстага неба над галавой, да таго, што маем зараз.





Материал подготовила:
Каменко Екатерина Александровна
ФММП, группа 10507220

Белорусский национальный технический университет

Управление по воспитательной работе с молодежью

Выставка "История Великой Отечественной войны в лицах"

Е. А. Каменко

# КАМЕНКО ИВАН МАРТЫНОВИЧ

Минск БНТУ 2021